Надзея ПАРЧУК, г. Брэст

## *Вясновы настрой*

*Адчыню паўднёвае акно –*
*Хай пакой напоўніцца вясною,*
*Па якой сумуецца даўно,*
*Асабліва зімняю парою.*

*Хай запахне свежасцю ў мяне –*
*У прыбранай чысценька святліцы –*
*Расцвіце зноў сонейка ў акне*
*І душа ўрачыстасцю натхніцца.*

*І вясна, і светлыня павек*
*Анікому з нас не надакучаць.*
*Іх вітае добры чалавек,*
*Захапляцца імі дзетак вучыць.*

## *Раніцай*

*Прачнуўся світанак і плюхнуўся*
*ў рэчку,*
*Туды, дзе раскінуўся Мухаўца плёс,*
*А ветрык-свавольнік пранёсся*
*над грэчкай*
*І знік нечакана ў блакіце нябёс.*

*І стала ў паветры зноў ціха і міла,*
*І стала так светла над весняй зямлёй,*
*Што бусел распростаў дайжэзныя*
*крылы*
*І жвава падаўся да рэчкі Лясной.*

### ***

*Абсыпана кветам галіначка кожная,*
*Бы снегам пушыстым зімой.*
*Якая ж ты, вішанька, сёння прыгожая!*
*Век бы стаяла з табой.*

*Так бы і дыхала водарам слодычы,*
*Душу гаіла красой,*
*Сэрца чулліва пахам спатолячы,*
*Ранак вітала б з расой.*

*Ды птушкай вірлівай жыццё*
*пралятае,*
*Хутка і квет абляціць.*
*Сёння вясну мы з табою вітаем*
*І дай Бог да новай дажыць.*

### ***

*Жывое дзеючае слова,*
*Ляці над роднаю зямлёй,*
*Ляці за ветрыкам паўднёвым,*
*Свяціся людзям дабрынёй.*

*Звіні і лейся ў сінім небе*
*Ды адгукайся жаўруком,*
*Бо мы жывём не толькі хлебам,*
*Мы словам праведным жывём.*